# УПЛЫЎ АРТ-СУПОЛКІ ІМЯ ТАДЭВУША РЭЙТАНА НА ЎСПРЫМАННЕ СПАДЧЫНЫ "МЯСЦОВЫМІ"

**ПАВЕЛ БУЛАТЫ**

***Анатацыя:*** Важным момантам у працэсе захавання помнікаў культурна-гістарычнай спадчыны з'яўляецца ўспрыманне іх людзьмі, якія жывуць у непасрэдным асяроддзі спадчыны. На прыкладзе Арт-суполкі імя Тадэвуша Рэйтана разгледзім, як дзейнасць супольнасці ўплывае на светапогляд "мясцовых" у дачыненні да спадчыны – сядзібна-паркавага комплексу Рэйтанаў у вёсцы Грушаўка (Ляхавіцкі раён, Брэсцкая вобласць).

***Ключавыя словы:*** культурна-гістарычная спадчына, арт-суполка, сядзіба Рэйтанаў.

# THE INFLUENCE OF TADEVUŠ REJTAN'S ART COMMUNITY ON THE PERCEPTION OF THE HERITAGE BY "LOCALS"

***Abstract:*** The perception of the heritage by the people who live in the immediate vicinity is an important point in the process of preservation of monuments of cultural and historical importance. Through the example of Tadevuš Rejtan's Art community we will analyse the way the community's work affects the outlook of the "locals" in relation to the heritage, Reitan's manor-park complex in the village of Hrušaǔka.

***Keywords:*** Cultural and Historical Heritage, Art Community, Rejtans' Homestead.

Сучасны свет – прадукт доўгага станаўлення чалавечай думкі, якая зараз развіваецца неймаверна імкліва, і час змены тэхналогій на прынцыпова новыя скарачаецца да мінімуму. Яшчэ сённяшнія навінкі, заўтра становяцца ўжо гісторыяй, перажыткам мінулага. Імкліва мяняюцца не толькі тэхналогіі, але і погляды, уяўленні, у тым ліку на культурна-гістарычную спадчыну. Класічныя формы рэпрэзентацыі спадчыны на сённяшні момант губляюць сваю актуальнасць і становяцца не эфектыўнымі, не спраўляючыся з выклікамі грамадскасці і знешняга асяроддзя. Так, трансляцыя спадчыны празшкло музейных вітрын і знаёмства са здабыткамі народаў са старонак шматтомных акадэмічных фаліянтаў – бачанне пазамінулага часу. Сацыяльная адаптацыя спадчыны (без нанясення шкоды) – актуальны кірунак дзейнасці.

Праблемы адаптацыі (перадусім сацыяльнай) маюць шматбаковую тэарэтычную і практычную актуальнасць. Сацыяльную адаптацыю можна акрэсліць як працэс прыстасавання спадчыны да ўнутраных (структура і функцыі аб’ектаў) і знешніх змен, якія адбываюцца ў грамадстве. Да гэтых змен можна аднесці: сацыяльныя стэрэатыпы паводзін і практык, пануючыя каштоўнасці, метады інфармацыйнага адлюстравання рэчаіснасці. Сама спадчына тут з’яўляецца сродкам і вобразнаю мадэллю спосабу адаптацыі чалавека да культуры, спрыяе аднаўленню цэласнасці светаўспрымання. На сучасным этапе развіцця мадэлі сацыяльных узаемаадносін спадчына з’яўляецца своеасаблівым перакрыжаваннем галоўных трансфармацыйных кірункаў у сусветнай гаспадарцы, навакольным асяроддзі, сацыяльных і культурных інстытутаў. І тут роля спадчыны актуалізуецца, што вызначае яе як нацыянальны стратэгічны рэсурс, які мусіць дакладна ўпісацца ў сацыяльную мадэль. Аднак для сацыяльнай адаптацыі спадчыны аднаго памкнення адмыслоўцаў не дастаткова. Важны момант у адзначаным працэсе – змяненне светапогляду і ўспрымання спадчыны яе фактычнымі “ўладарамі” – людзьмі, што жывуць і дзейнічаюць у непасрэдным мікраасяроддзі галоўнага атракта. Ад стаўлення да помніка (помнікаў) яго “суседзяў” залежыць шмат, а галоўнае – яго захаванне і падтрыманне жыццяздольнасці.

Рэаліі беларускага грамадства такія, што для таго, каб “мясцовыя” ўсвядомілі значнасць спадчыны, ім трэба паказаць прыклад зацікаўленасці да яе звонку. На прыкладзе Арт-суполкі імя Тадэвуша Рэйтана разгледзім, як дзейнасць супольнасці ўплывае на светапогляд “мясцовых” у дачыненні да спадчыны – сядзібна-паркавага комплексу Рэйтанаў у вёсцы Грушаўка (Ляхавіцкі раён, Брэсцкая вобласць).

Арт-суполка, названая ў гонар нацыянальнага героя Беларусі, знакамітага пасла ад Наваградскага ваяводства, які ўвайшоў у

гісторыю як непахісны праціўнік падзелаў Рэчы Паспалітай, Тадэвуша Рэйтана паўстала ў кастрычніку 2013 г. Яе галоўная стратэгічная мэта – дамагчыся стварэння ў Грушаўцы нацыянальнага мемарыяльнага музея, які б выкарыстоўваў багаты рэсурс захаванай спадчыны. Кірункі дзейнасці суполкі наступныя: папулярызацыя ў беларускім грамадстве постаці Тадэвуша Рэйтана (а перадусім разбурэнне міфаў пра яго) і іншых прадстаўнікоў роду Рэйтанаў праз выставы, перформансы, мультымедыя і інш., а таксама падтрыманне парадку ў сядзібе. Адзначым вельмі важную акалічнасць: суполка не займаецца аднаўленчай ці рэстаўрацыйнай працай, гэтак званым "аматарскім аднаўленнем", якое нясе яшчэ больш шкоды помніку. Практычная дзейнасць накіраваная выключна на падтрыманне парадку і прадухіленне разбурэнняў.

На 2013 г. сядзіба Рэйтанаў знаходзілася ў жахлівым стане. Будынак сядзібы стаяў без вокнаў і дзвярэй, скляпенні выкарыстоўваліся як бульбасховішча, дах флігеля быў сур'ёзна пашкоджаны, гаспадарчыя пабудовы зараслі дрэвамі і бур'яном (некаторыя выкарыстоўваліся па сваім прызначэнні), сад і парк патанулі ў дзікіх зарасніках. У той жа год суполкай была праведзеная грунтоўная талака па добраўпарадкаванні сядзібы, а таксама пачаліся асцярожныя камунікацыі з мясцовымі органамі ўлады і насельніцтвам суседніх вёсак. Гэта мела пэўны плён, бо ў хуткім часе на сядзібу была звернутая ўвага.

Калі першапачаткова мясцовая ўлада знаходзілася ў стане назірання за арт-суполкай і трымалася пазіцыі "не перашкаджаць", то пазней адбылася пэўная актывізацыя крокаў насустрач. Так, райвыканкам стаў праводзіць свой штогадовы красавіцкі суботнік у Грушаўцы (*Ляхавіцкі веснік*, 2016), а таксама, хоць і замаруджана, працягваць мерапрыемствы па кансервацыі помніка. На наш погляд, гэта наўпрост звязана з дзейнасцю суполкі: мясцовай уладзе было прадэманстравана, што ў сядзібе ёсць зацікаўленасць, яна з'яўляецца чымсьці звыштрывіяльным і мае каштоўнасць. Такое ж станоўчае змяненне адбылося і ў стаўленні мясцовых жыхароў, што пацвярджае іх удзел у талацэ. Відавочна, што ў свядомасці "мясцовых" адбыліся станоўчыя зрухі ў стаўленні да помніка. Адбыўся пераход з пазіцыі ўспрымання сядзібы як "старой развалюхі" да погляду як на "штосьці важнае". Аднак гэтага не дастаткова, каб адбылася поўная сацыяльная адаптацыя помніка. Трэба, каб быў здзейснены наступны крок – замацаванне погляду на сядзібу як на "штосьці важнае, што прыносіць карысць". Такі крок пакуль не зроблены, але пэўныя зрухі ёсць. І дапамагае ў гэтым выкарыстанне сядзібы індустрыяй турызму, а таксама арганізацыя фестывалю.

Так, штогод арт-суполка ладзіць у сядзібе фестываль мастацтваў ДАХ, а двойчы сумесна з мерапрыемствам суполкі ў Грушаўцы

быў праведзены традыцыйны раённы фэст фальклору «З крыніц спрадвечных». Як вядома, мерапрыемствы фестывальнага характару прывабліваюць, апроч творчых удзельнікаў, яшчэ і рамеснікаў, гандляроў харчу, сувеніраў і г.д. На згаданым фестывалі сядзіба выступае ў ролі выдатнага атракта і стварае непараўнальнае асяроддзе для правядзення мерапрыемстваў падобнага кшталту, што прываблівае шматлікіх наведвальнікаў. Калі першы фестываль суполкі меў збольшага закрыты і элітарны характар, то апошні меў характар больш масавы, публіка была рознай (*Новы Час*, 2016). Хацелася б, каб пашырэнне публікі стала адлюстраваннем папулярнасці сядзібы і каб мясцовыя ўлады і жыхары змянілі сваё стаўленне да помніка як да важнага сацыяльна-эканамічнага інстытута: спачатку ў межах рэгіёна, а потым – краіны.

Акрамя вышэйпрыведзеных кірункаў, зазначым яшчэ адзін досыць важны бок дзейнасці, які спрыяе сацыяльнай адаптацыі помніка спадчыны і стварэнню яго станоўчага вобразу, – гэта даследчая праца і публікацыя вынікаў у навукова-папулярных выданнях. Так склалася, што звесткі адносна роду Рэйтанаў досыць сціпла прадстаўлены ў літаратуры, а постаць Тадэвуша Рэйтана апутаная разнастайнымі міфамі (гл. Юркевіч, 2016: 128–136), створанымі ў розныя эпохі. Даследчы кірунак дзейнасці разлічаны на аўдыторыю досыць шырокую, уплыў на якую не менш значны, чым уплыў на мясцовых жыхароў. Дзякуючы апублікаваным працам, павялічваецца пазнавальнасць сядзібы, род Рэйтанаў уваходзіць у свядомасць беларусаў.

Такім чынам, на прыкладзе дзейнасці невялікай культурніцкай суполкі і ўзаемадзеяння яе з мясцовым насельніцтвам і функцыянерамі, ад якіх, па сутнасці, залежыць захаванне спадчыны, адбываецца яе пэўнае пераасэнсаванне і зрухі ў станоўчым кірунку. Хочацца верыць, што і надалей крокі па новым усведамленні спадчыны будуць зроблены і сядзіба Рэйтанаў стане важным культурным і сацыяльным асяродкам нашай краіны.

### *Бібліяграфія*

1. *Ляхавіцкі веснік* (2016). "Рабочая субота. Разам!" 27.04.2016.

2. "У Грушаўцы прайшоў фэст «ДАХ-31 РЭЙТАН»", Новы Час, URL (доступ 20.06.2017): https://novychas.by/kultura/u-hruszaucy-prajszou-fest-dah-31-rejtan-fota

3. Юркевіч, Зміцер (2016). "Калі нарадзіўся Рэйтан", *Маладосць,* 6: 128–136.